УДК 398.3

*І.А. Швед*

# «МОВА» КОЛЕРУ Ў БЕЛАРУСКІМ АБРАДАВА-МІФАЛАГІЧНЫМ ТЭКСЦЕ ПАХАВАННЯ

Артыкул прысвечаны пытанням семантыкі і функцыянавання колеравых сімвалаў у беларускай пахавальна-памінальнай абраднасці і звязаных з ёю вербальных тэкстах. Гісторыка-генетычнае вывучэнне, якое арыентуецца на дыяхранічны і парадыгматычны разгляд «мовы» колеру як цэласнага фенамена знакава-сімвалічнай сістэмы абрадава-міфалагічнага тэксту пахавання, дапаўняецца функцыянальна-семантычным даследаваннем. Белы, чорны, чырвоны, жоўты, зялёны і сіні колеры інтэрпрэтуюцца як важныя структурна-семантычныя атрыбуты абрадавага тэксту, арганізуючыя фактары міфалагічнай храматычнай камунікацыі, скіраванай на вынас фізічнай смерці з прасторы жыцця і ахову апошняй ад дэструктыўнага ўздзеянні прадстаўнікоў замагільнага свету.

## Уводзіны

Важнасць колераў як семантычных катэгорый у беларускіх сямейных, каляндарных і аказіянальных абрадах відавочная. Многія з гэтых абрадаў, як сведчаць шматлікія фальклорна-этнаграфічныя апісанні, літаральна насычаны колерам. Удзельнікі абрадаў выкарыстоўваюць прадметы і жывёл прадпісанага колеру і самі маюць касцюм кананізаваных колераў; у вызначаны традыцыяй колер «пераапранутыя», якія ўвасабляюць прадстаўнікоў«чужога» свету,афарбоўваюць цела і твар – найчасцей гэта белы, чырвоны і чорны колеры, якім надаецца пэўнае значэнне. Колеравая прыкмета, як правіла, перадаецца праз прадстаўленне вызначанага традыцыяй прадмета – яе носьбіта (вопратка, аксесуары, прадметны рад і інш.). Асноўныя ідэі і мэты рытуалаў (дэкларацыя пераходу ў новыя сацыяльны, біялагічны станы, замацаванне адпаведнага статуса, прадуцыраванне дабрабыту, ахова, кампенсацыя, пакрыццё пэўнага дэфіцыту, трансляцыя інфармацыі пра псіха-фізічны, сацыяльны, матэрыяльны станы ўдзельнікаў рытуалу, вырашэнне задач полавай ініцыяцыі, выяўленне эстэтычных, эмацыянальных і іншых ацэнак (колер як знак здаровага/нездаровага, прыгожага/непрыгожага, багатага/беднага, высокага/нізкага сацыяльнага статуса і г.д.) рэалізуюцца таксама праз актуалізацыю каларыстычнага «слоўніка» вербальнай складаючай абрадавых комплексаў [1].

Сучаснай навукай раскрываюцца шматлікія асаблівасці «мовы» колеру ў розных семіятычных сістэмах, вызначаецца роля колеру як інструмента кадзіравання важных культурных сэнсаў і сацыяльных паводзін, яго значэнне ў тых ці іншых камунікацыях, а таксама рэалізуюцца разнастайныя падыходы да асэнсавання накопленага чалавецтвам багатага фонду колеравай сімволікі, які шырока выкарыстоўваецца ў пэўных дыскурсах. Многія айчынныя і замежныя даследчыкі, хто звяртаўся да праблематыкі традыцыйнага храматызму, вызначэння спецыфікі «мовы» колераў у народных культурах славян (Я. Крук, Т. Шамякіна, І. Швед, Л. Радэнкавіч, В. Бялова, М. Талстой і інш.), абапіраюцца на напрацоўкі В. Тэрнера ў гэтай галіне (Символ и ритуал. М., 1983). У кантэксце даследавання пахавальнай абраднасці ўсходніх і паўднёвых славян некаторыя аспекты сімволікі колераў, у прыватнасці белага і чырвонага, паспрабавала вызначыць В. Седакова [2, с. 206]. Б. Успенскі ў сувязі з вывучэннем пытання суаднесенасці Воласа з замагільным светам выказаў гіпотэзу, што чырвоны колер у пахавальным абрадзе з’яўляецца сінонімам золата, характарызуе замагільны свет, і падкрэсліў, што гэта колер праціўніка Бога Грамоўніка [3, с. 60–61]. Украінскія і балканаславянскія паралелі ў «мове» колеру пахавальнага галашэння разгледзела А. Мікіценка [4]. Гэтая

«мова», паводле назіранняў украінскай даследчыцы, канцэнтруецца пераважна на семантычна значным колеравым атрыбуце «чорны», які мае «однозначно отрицательную семантику» [4, с. 23]. Вучонымі заўважана, што ў народнай культуры белы і чырвоны колеры з'яўляюцца колерамі жалобы і што жалобная сімволіка чорнага колеру – такога звычайнага колеру жалобы для сучаснага чалавека – больш позняга паходжання і звязана з культурай перыяду хрысціянства. Між тым да гэтага часу адсутнічала спецыяльнае даследаванне колеравага кода пахавальна-памінальнай абраднасці беларусаў. Мэта гэтага артыкула – вызначэнне семантыкі і функцыянавання «мовы» колеру ў беларускім абрадава-міфалагічным тэксце пахавання.

**Белы колеру пахавальна-памінальнай абраднасці**

Белае, семантызаванае як пустое, бесцялеснае, якое асацыюецца з замагільным светам, шырока выкарыстоўвалася ў абрадзе пахавання і выступала знакам жалобы ў беларускай і іншых традыцыях. Паводле шматлікіх этнаграфічных апісанняў, нябожчыка ў Беларусі апраналі ў чыстую белую адзежу (мужчыну – у белыя штаны і кашулю, жанчынам на ногі нацягвалі белыя панчохі), труну засцілалі белай тканінай, а бакавыя сценкі яе аббівалі белым каленкорам ці палатном, пад галаву клалі падушку ў белай навалачцы [5, с. 117, 126, 131, 137]. *«Подушку шылі з сена, а наволочка білінька»* [Здзітава Бярозаўскага р-на][*]. Белымі латкамі абкручвалі нябожчыку ногі (згадаем сучасны выраз: *«Бачыў я цябе ў труне ў белых тапачках»*). *«Рукіі ногі звязвалі покойніку мутузочкамі беленького цвета, а як прывязуць ужо на кладбішча, всё раскідаюць і развязваюць, хто ў труне астаўляе, хто ў яму кідае»* [Здзітава, Бярозаўскі р-н]. Белыя латкі, якімі звязвалі нябожчыку ногі, надзяляліся забараняльнай, спыняльнай, ахоўнай функцыямі і адыгрывалі важную ролю ў магічных прыёмах народнай медыцыны: *«Белымі тряпачкамі звязвалі ногі і рукі, а потым кладут в гроб, а некоторые прыкладвалі к больному месту»* [Вялікая Турна, Камянецкі р-н]. Белымі рэчамі маркіруецца рытуальна ўзаконеная прастора смерці – могілкі. Белыя стужкі, фартухі вешалі на надмагільныя крыжы; пры гэтым светлае (белае) магло карэляваць з жаночым пачаткам: «А стужкі на крыжы вешаюць на могілках? – *Мужэковэ тэмнішэ, а жэншчыны светлішэ. Ніколэ вішалы такі хвартушкі, шылы біленькы, з білого матер'ялу»* [Спорава, Бярозаўскі р-н].

У абрадах «пахавання-вяселля» памерлых дзяўчат апраналі ў белае, на галаву завязвалі белую хустку [5, с. 139]. Паводле шматлікіх наратываў, памерлыя продкі паказваюцца жывым сваякам у белым: *«Суседка на радасные дзеды пазвала ўсих дзедоў, дзе хто буў на белам сьвеце. Пришли ўси ў беленькам платти. Хлопцы у капэлюшох, дзеўки у беленьких тухликах. Сцягали ее с печи, цягали па хаци»*[6, с. 88]. Палешукі апавядаюць, што русалак бачылі ў«шлюбным» убранні белага колеру, у абмотках з белага палатна на нагах [7, с. 31]. Нярэдка ўдакладняецца: русалка ходзіць у белых абмотках таму, што калісьці ў іх хавалі нябожчыкаў [7, с. 37]. Узнікненне ўяўленняў пра белую вопратку тагасветных істот, такім чынам, можа непасрэдна матывавацца абрадавай практыкай.

У пахавальным абрадзе белы колер абазначаў не толькі пераход у іншасвет, быў знакам жалобы, але і мог актуалізаваць ідэю чысціні нябожчыка. Так, белы ручнік, чы-

---

[*]У працы выкарыстаны матэрыялы архіва вучэбнай фальклорна-краязнаўчай лабараторыі УА «БрДУ імя А.С. Пушкіна», якія сабраны ў выніку палявых даследаванняў, праведзеных аўтарам гэтай працы, выкладчыкамі і студэнтамі БрДУ на працягу 1993–2011 гг. па праграме, спецыяльна распрацаванай аўтарам дадзенай работы. Гэтыя матэрыялы прыводзяцца далей без указання на тое, што яны захоўваюцца ў названым архіве.

стае палатно ўяўляліся шляхам для добрай душы памерлага чалавека ў той час, як памерламу чараўніку клалі шнур, каб лягчэй яго душа адыходзіла ў іншы свет [8, с. 8]. Белы ў традыцыях розных народаў – не толькі атрыбут смерці, але і знак рытуальнай чысціні, адраджэння праз пераадоленне памежнага стану. У сувязі са сказаным важнае заключэнне, зробленае В. Тэрнерам: «В ритуалах, связанных с жизненными кризисами, белым смывается состояние ритуальной смерти, т.е. преодолевается пограничное состояние между двумя периодами активной социальной жизни» [2, с. 67]. Пры гэтым функцыя белага ў абрадзе супадае з функцыяй вады [2, с. 67].

У разгляданым кантэксце характэрная практыка ў сям'ях, дзе працягвалася жалоба па памерлых, свяціць менавіта нефарбаваныя (белыя) яйкі: *«У кого покойнік у гэтому году, яйца ны красылы і святылы ны покрасёнымы»* [Стахава, Столінскі р-н]. На Палессі на Вялікдзень на могілкі хадзілі з белымі яйкамі: *«На навського варылы то білы, з білымы йдуть на молыці...»* [9, с. 353]. Між тым вядомыя забароны бяліць у хаце на працягу 40 дзён пасля смерці каго-небудзь з родных, а таксама ў памінальныя дні, бо *«покойникови глиною очы заллеш»* [10, с. 267].

**Чырвоны колер у пахавальна-памінальнай абраднасці**

Яшчэ з часоў палеаліту, як адзначаюць многія даследчыкі, чырвоны колер прадстаўлены ў пахаваннях: вохрай звычайна пасыпалі памерлых, якіх хавалі ў скурчаным выглядзе. У пахавальнай абраднасці беларусаў чырвоны колер абазначае пераходны статус памерлага, прыналежнасць да іншасвету і адначасова абараняе ад небяспекі, якая выходзіць ад нячыстай сілы, маркіраванай гэтым колерам [1]. Так, у некаторых мясцовасцях нябожчыку завязвалі чырвонай ніткай рукі і ногі, труну некалькі разоў з канца ў канец абмотвалі чырвонай ваўнянай ніткай. Такую самую нітку маглі класці ўпоперак цела памерлага (канцы ніткі выпускаліся з труны – гэта чырвоная «дарога ў магілу»). У заходняй Беларусі галаўны ўбор для нябожчыка рабіўся з матэрыі чырвонага колеру. Нябожчыку «надзяваюць шапку: мужчынам – мужчынскую, а жанчынам – жаночую, зробленую з чырвонай матэрыі» [5, с. 138]. Адпраўляючы нябожчыка ў апошні шлях «рукавы ля кісці рукі перавязваюць чырвонай жычкай» [5, с. 102], а яго самога абвязваюць чырвоным поясам [Перасудавічы, Бярозаўскі р-н]. *«Калі ж на кані вязуць цела, на дугу прывязваюць чырвоны пояс ці стужку кваціcтую, труну апяразваюць чырвоным поясам ці хусткаю»* [5, с. 110]. Чырвонай ніткай абвязвалі надмагільны крыж, што, сярод іншага, было апазнавальным знакам [5, с. 184]. Ва ўсходнеславянскім абрадзе хрышчэння і пахавання зязюлі абавязкова выкарыстоўваецца хустка (ці стужка) чырвонага колеру. Чырвоны колер у такіх кантэкстах хутчэй суадносіцца не з жыццём, а са смерцю, з іншасветам, і разам з тым паводле прынцыпу «падобнае адганяе падобнае» ахоўвае пазначаных ім істот ад дэструктыўнага ўздзеяння дэманічных сіл. У шэрагу кантэкстаў чырвоныпроціпастаўляецца беламу колеру як атрыбуту смерці і выкарыстоўваецца ў актах прафілактычнай магіі. Акрамя гэтага чырвоны колер у пахавальнай ды іншай абраднасці надзяляецца медыятыўнай семантыкай, звязвае чалавечы свет з іншасветам. Па гэтых прыкметах чырвоны колер збліжаецца з белым і жоўтым. У сувязі са сказаным згадаем пахавальны звычай Гродзенскага Панямоння класці ў труну пояс, а пазней стужку або нітку *«шарсцяную, ці красненькую, ці беленькую, ці жоўценькую»* [11, с. 667]. Чырвоны (як і белы) колер уваходзіць у склад вясельнага кода, які актуалізуецца ў абрадзе пахавання маладых людзей з мэтай пераадолець драму іх нуздзейсненага лёсу. Так на Палессі хлопца хавалі ў вясельнай вопратцы, абвязвалі чырвонай стужкай фуражку [10, с. 256].

Чырвоныя прадметы нярэдка фігуруюць у памінальных абрадах, у тым ліку велікодных [5, с. 150]. У некаторых мясцовасцях ручнікі, якімі абвязваюць магільныя крыжы на Радуніцу, затканыя толькі чырвонымі ніткамі [ПА; Верхнія Жары, Брагінскі р-н]. Разам з тым, як можна меркаваць, на асацыяцыі чырвонага колеру са здароўем, жыццёвымі сіламі пабудаваны шэраг палескіх забарон выкарыстоўваць прадметы гэтай афарбоўкі ў пахавальным абрадзе [10, с. 270] (хоць у гэтым жа абрадзе, як адзначалася вышэй, рэчы чырвонага колеру маглі выконваць медыятыўную і ахоўную функцыі). Так, падушку, якая клалася пад галаву памерламу, не вышывалі чырвоным, чырвоныя стужкі *(лыткі)* ў некаторых мясцовасцях не ўжывалі для звязвання рук і ног памерламу і г.д. [9, с. 345]. Лічылася, што ў чырвоным *(бардовым)*як такім, што сімвалізуе жыццё і ахоўвае яго, хаваць нябожчыка нельга, бо яго жывыя сваякі пачнуць хварэць [Гошчава, Івацэвіцкі р-н; Здзітава, Бярозаўскі р-н]. У Палессі жанчыне-нябожчыцы завязвалі белую ці чорную хустку, *«ничого не було красного»* [ПА; Баравое, Ракітнаўскі р-н Ровенскай вобл.]. Між тым рукі і ногі нябожчыку маглі звязваць не толькі чорным, белым, сінім, але і чырвоным шнурам (ці ніткай, стужкай) [ПА; Баравое, Ракітнаўскі р-н Ровенскай вобл.]. Чырвоную нітку, якой былі звязаны рукі і ногі памерлага, выкарыстоўвалі для лекавання зляку, навязвалі яе на руку [ПА; Велута, Лунінецкі р-н]. Практыкай выкарыстання чырвоных нітак для звязвання ног памерлага матываванае ўзнікненне наратываў аб прадказаннях смерці, а таксама ачышчальных абрадаў тыпу «пахавання таракана», калі насякомаму прывязвалі чырвоную нітку і клалі яго ў лапаць, які неслі на перакрыжаванне, імітуючы пахавальную працэсію [ПА; Чэлхаў, Клімаўскі р-н Бранскай вобл.]. У в. Верхнія Жары Брагінскага раёна апавядалі пра чалавека, якому падалося, што ён уваходзіць у гумно і бачыць дзвюх дзяўчынак з нагамі, перавязанымі чырвонымі ніткамі. Калі ён вярнуўся дахаты, даведаўся пра смерць сваіх дзвюх дачок [ПА]. Сувязь чырвонага колеру са светам памерлых ускосна прадстаўлена ў наратывах пра наведванне жывымі таго свету, у абміраннях. У прыватнасці, чырвоным колерам могуць маркіравацца вароты, якія раздзяляюць гэты і той светы, як у наступным аповедзе, запісаным намі ў в. Перасудавічы Бярозаўскага р-на: *«Сныцця: ідэм мы з Володей [нябожчыкам] за рукы побравшыся, а мы з ім заўжды дружна жылі. I він кажэ: «Хучій, хучій, бо мні трэба до дванаццаці часов трэба вэрнутысь». Я тый сон і зараз помню. Подходымо, а красны ворота высокы-высокы стоять, красны ворота! Кажэ: «Стій тут, а мні трэба за гэты ворота іты». Я кажу, шо і я с тобой, побачу, шо там. А вун мэнэ нэ пустыў туда. Сказав: «Тобі шэ рано». На гэтом я прочынаюсь, думаю: «А, Господі мылінькі, а шо ж гэто? Чы мні прыдалося гэто?» Я і зараз помню, як я з ім іду. I тыі ворота прэдставляю, высокы-высокы, красны ворота такыі. I вун пушов за тыі ворота, а я осталася. Його ныма. Зайду і я туды… Всі зайдэм».*

**Чорны колер у пахавальна-памінальнай абраднасці**

Сярод усіх сімвалічных значэнняў чорны колер, як вядома, абазначаў перш за ўсё смерць і прыблізна з сярэдзіны XVI ст. канчаткова сцвердзіўся ў Еўропе як жалобны. Пры гэтым ён мог быць і толькі чорным і спалучацца з белым [12, с. 163]. У шэрагу лакальных традыцый Беларусі ў пахавальным абрадзе дамінуе чорны (цёмны) колер (згадаем пашыранае ўяўленне пра цемнату замагільнага свету).

Нябожчыка нярэдка апранаюць у цёмную вопратку, жанчыне завязваюць хустку цёмнага колеру, *«на ногі надзяваюць наскора пашытыя з чорнага каленкору бушмакі»* [5, с. 132, 134], люстэркі завешваюць чорнай тканінай, на надмагільны крыж завязваюць чорную стужку і г.д. Пры выбары колеравай палітры важны ўзроставы крытэрый.

У вопратцы памерлых старых пераважае менавіта чорны колер, які ў традыцыйных уяўленнях асацыюецца яшчэ і са старасцю. Чым старэйшы нябожчык, тым цямнейшае яго адзенне [10, с. 256]. Маладзейшым памерлым, у прыватнасці ў Магілёўскім Падняпроўі, абуваюць белыя туфлі, больш сталым – цёмнага колеру. Удзельнікі пахавальнага абраду звычайна апранутыя ў чорнае (цёмнае) адзенне: «Поруч з ім [нябожчыкам] гарыць свечка, у хаце ходзяць у чорным, а калі не – дык прынамсі жанчыны ў чорных хустках» [5, с. 153]. У Палессі тыя, хто суправаджаў нябожчыка на могілкі, апраналіся ў вывернутае чорнае адзенне [5, с. 151] (падвоены знак жалобы). Чорны колер як знак жалобы актуалізуецца ў галашэннях пры выяве ўдзельнікаў пахавальнага абраду: *«…Але ж усе ў чорным адзеты. // Баль ты сабраў невясёлы»* [5, с. 392]. У галашэннях цёмная хата («цёмная цямніца» [5, с. 409]) памерлага проціпастаўляецца беламу свету [5, с. 280, 303, 268, 236]. Традыцыя пахавальнага галашэння ў беларусаў, звязаная з эпічнай традыцыяй славян, нярэдка абыгрывае вобраз чорнага ворана, які варожыць смерць і выступае метафарай велізарнай птушкі, што закрывае сонца для згубіўшых роднага чалавека сваякоў: *«…А не ўспела яшчэ добра ягадка сазрэці, // Наляцелі чорны вораны // І зацьмілі сонца яснае…»* [5, с. 353]. Такая ж вобразнасць характэрная для пахавальныхгалашэнняў іншых славянскіх традыцый, у прыватнасці паўднёваславянскіх тужбаліц. У беларускіх песнях можазгадвацца вобраз чорнай труны (дубіны).

Са смерцю асацыюецца чорны колер у беларускіхнародных тлумачэннях сноў. У адным з наратываў чорны колер (у адрозненне ад светлага, ззяючага) вопраткі Божай Маці ўказвае на трагічную сітуацыю, абазначае стан жалобы. Апавядалі, да прыкладу, што ў час перастрэлкі паміж салдатамі Чырвонай Арміі і фашысцкімі акупантамі абодва бакі пачулі, што ў прасторы паміж імі плача жанчына. Пасля таго, як перасталі страляць і дым рассеяўся, усе ўбачылі жанчыну ў чорным, яе рост быў каля трох мет-раў. Яна схілялася над кожным забітым і плакала. Гэта была Божая Маці [Кустын, Брэсцкі р-н].

### Зялёны колер у пахавальна-памінальнай абраднасці

У «мове» пахавальна-памінальнай абраднасці разам з чорным колерам можа выкарыстоўвацца зялёны, у прыватнасці гэтыя колеры прадстаўлены ў вышыўцы на падушцы, што клалася пад галаву нябожчыку [9, с. 345]. У Гродзенскім Панямонні зялёны тканы пояс вешалі на надмагільны крыж [11, с. 667]. Яйкі зялёнага колеру вядомыя як памінальная ежа ва ўсходніх славян і балгар. У Палессі на Вялікдзень фарбавалі яйкі ў зялёны колер, калі на працягу года памёр хтосьці з сямейнікаў. *«Як хто умер, а год ешчо не вышэў, да нарвуть сена, або жыта и красять зелёные яйца»* [ПА; Радчыцк, Столінскі р-н]. На траецкія Дзяды ў Дынабургскім павеце на магілу прыносілі зялёныя яйкі, пафарбаваныя ў адвары з маладой зеляніны [5, с. 189].

Паводле беларускіх пахавальных галашэнняў, па зялёнай (летняй) дарозе да сваякоў можа вярнуцца душа памерлага: *«Калі ж ты ка мне ў госці прыйдзеш? // А ці ты зімовай парой, а ці ты летняй? // Зімовай парой – халодная дарога, // Летняй парой – зялёная дарога…»* [5, с. 298]. У іншых галашэннях зялёны лес (гай) выступае верагодным месцам сустрэчы памерлага з жывымі: *«Як прыйдзець цёпла лецечка, // А пайду я ў зялёны лес. // Там кукулькі кукаваць будуць, // І салавейкі шчабятаць будуць, // І я буду слухаць: // Ці не мае чадзенька з пташачкамі песенькі пяець?»* [5, с. 330]. І ў гэтым сэнсе зялёны гай з'яўляецца семантычна тоесным жоўтаму пяску, які надзелены сімволікай смерці: *«Куды нам, матулічка, пад цябе падходзіць? // Ці ў зялёны гаёчак, ці ў жоўты пясочак?»* [5, с. 227]. У сувязі з традыцыяй маркіроўкі зялёным колерам таго свету (ці магілы) паказальны беларускі праклён: *«Каб табе на зелле!»*.

**Сіні колер у пахавальна-памінальнай абраднасці**

У абрадава-міфалагічным тэксце пахавання выяўлена непасрэдная сувязь сіняга колеру са смерцю. У некаторых беларускіх лакальных традыцыях сіні колер абазначаў жалобу, падкрэсліваў трагізм сітуацыі і выклікаў адпаведныя адмоўныя эмоцыі, і гэтым проціпастаўляўся пазітыўна асэнсаванаму чырвонаму колеру: *«Ногі покойніку завязвалі сінію лентою, коб було больш жалобно. Бо чырвона – радосць. После гэту ленту клалы в гроб»* [Хомск, Драгічынскі р-н]. Цёмна-сінія стужкі завязваюць на крыжы, помнікі, якія стаяць на магілах мужчын: «Ці прывязвалі ў вас чорныя стужкі на крыжы? –*Чорных стужак мало, у нас цветныя (мужчынам – тёмно-сіні, жэнчынам – зэлёны, розовы), а бывают, шо люды всім чорны вяжут тыпа траура, а в нас ныма, можэ, дэ е, у нас не»* [Перасудавічы, Бярозаўскі р-н]. У сем'ях, дзе на працягу года быў нябожчык, асабліва т. зв. «нячысты» памерлы, велікодныя яйкі маглі фарбаваць у сіні колер, які ў гэтым кантэкце ўтвараў апазіцыю чырвонаму і сінанімічную пару чорнаму і зялёнаму колерам: *«Яйца красили ў суботу. Красна субота завецца. Як у каго ў радни умре ў етам гаду, дак красяць чорнаю или зелёнаю или синяю краскаю. А так – краснаю»* [6, с. 126]. Як бачым, паміж пэўнымі чыннікамі колеравага кода пахавальна-памінальнай абраднасці ўсталёўваюцца тыя ці іншыя адносіны, колеравыя сімвалы ўтвараюць адпаведныя дыяды і трыяды. Прычым тая самая пара колераў, якая ў адных кантэкстах з'яўляецца апазіцыйнай, у іншых можа выступаць як сінанімічная ці ўзаемадапаўняльная.

**Заключэнне**

Белы, чырвоны, чорны, зялёны і сіні колеры – гэта вызначальныя чыннікі «мовы» беларускага абрадава-міфалагічнага тэксту пахавання, арганізуючыя фактары міфалагічнай храматычнай камунікацыі, скіраванай на вынас фізічнай смерці з прасторы жыцця і ахову апошняй. Найбольшай частотнасцю пры гэтым адзначаны колеры, якія складаюць універсальную трыяду «белае – чырвонае – чорнае». Колеравы код дубліруе асноўны змест пахавальнага абраду (пераход чалавека з аднаго статуса ў іншы, са сферы чалавечай у касмічную сферу дзядоў, духаў-ахоўнікаў, выцясненне смерці і замыканне разарванай мяжы паміж тым і гэтым светам), а таксама ўзмацняе агульную скіраванасць і выразнасць абрадавага тэксту, яго паэтычнай структуры. Семантычную шырыню колеравых атрыбутаў у вербальных тэкстах вызначае спецыфіка абрадавай практыкі і ўсёй вусна-паэтычнай традыцыі. Разгледжаныя колеры захавалі сувязь з архетыпавымі ўяўленнямі і сталі асновай семантычных апазіцый тыпу «белы/чорны», «белы/чырвоны», «чырвоны/чорны». Прычым светлыя, «мажорныя» колеры часцей маюць пазітыўную ацэнку, сімвалічна асацыююцца з жыццём і проціпастаўляюцца цёмным (чорнаму, сіняму) колерам жалобы, смерціі прасторы, у якой яна валадарыць. Белы колер можа карэляваць са смерцю і нейтралізавацца чырвоным колерам (які, з аднаго боку, сімвалізуе жыццё, а з іншага – маркіруе аб'екты, якія належаць замагільнай сферы і як аднапрыродныяса смерцюрэаліімогуць процістаяцьёй). Між тым прадметы, маркіраваныя белым, а таксама чорным колерамі,надзяляюцца адгоннай функцыяй і выкарыстоўваюцца як абярэгі, фігуруюць у прафілактычнай магіі. Што да карціны беларускага традыцыйнага галашэння, то ў ёй дамінуюць атрыбуты «чорны», «цёмны», нярэдка яны выкарыстоўваюцца ў якасці пастаянных эпітэтаў у паэтычных формулах, звязаных з эпічнай традыцыяй. Усе разгледжаныя колеры выступаюць маркёрамі класаў ізафункцыянальных аб'ектаў (да прыкладу, элементаў вопраткі нябожчыка і ўдзельнікаў пахавальнага абраду) і могуць кваліфікавацца як прыкметы, што з'яўляюцца важным

інструментам асэнсавання і ментальнай арганізацыі абрадавай рэальнасці ў рамках усеахопнай антытэзы Жыццё – Смерць.

СКАРАЧЭННІ

ПА – Палескі архіў Інстытута славяназнаўства РАН

СПІС ЛІТАРАТУРЫ

1. Швед, І.А. Міфалогія колеру ў беларускай традыцыйнай духоўнай культуры / І.А. Швед. – Брэст : БрДУ, 2011. – 291 с.
2. Седакова, О.А. Поэтика обряда. Погребальная обрядность восточных и южных славян / О.А. Седакова. – М. : Индрик, 2004. – 320 с.
3. Успенский, Б.А. Филологические разыскания в области славянских древностей / Б.А. Успенский. – М. : Изд-во Московского ун-та, 1982. – 248 с.
4. Микитенко, О.О. Колористический код погребального оплакивания (балканославянские и украинские параллели) / О.О. Микитенко // Первый Всерос. конгресс фольклористов, Москва, 1–6 февраля 2006 г. : сб. докладов : в 4 т. / Гос. респ. центр русского фольклора ; отв. ред. А.С. Каргин. – М., 2007. – Т. 4. – С. 23–29.
5. Пахаванні. Памінкі. Галашэнні / уклад. У.А. Васілевіча, Т.Б. Варфаламеевай. – Мінск : Навука і тэхніка, 1986. – 615 с.
6. Толстая, С.М. Полесский народный календарь / С.М. Толстая. – М. : Индрик, 2005. – 600 с.
7. Поліська дома. Фольклорно-діалектологічний збірник / упорядк. В. Давидюка і Г. Аркушина. – Вип. I. – Луцьк : Редак.-видав. відділ Волинського обл. управл. по пресі, 1991. – 188 с.
8. Лабачэўская, В. Повязь часоў – беларускі ручнік / В. Лабачэўская. – Мінск : Беларусь, 2002. – 231 с.
9. Климчук, Ф.Д. Духовная культура полесского села Симоновичи / Ф.Д. Климчук // Славянский и балканский фольклор. Этнолингвистическое изучение Полесья : сб. науч. ст. / РАН, Ин-т славяноведения и балканистики ; редкол.: Н.И. Толстой (отв. ред.) [и др.]. – М. : Индрик, 1995. – С. 335–382.
10. Кабакова, Г.И. Антропология женского тела в славянской традиции / Г.И. Кабакова. – М. : Ладомир, 2001. – 335 с.
11. Традыцыйная мастацкая культура беларусаў : у 6 т. / А.М. Боганева [і інш.]. – Мінск : Выш. шк., 2006. – Т. 3 : Гродзенскае Панямонне : у 2 кн., кн. 2. – 736 с.
12. Серов, Н.В. Цвет культуры: психология, культурология, физиология / Н.В. Серов. – СПб. : Речь, 2004. – 672 с.

***Shved I.A.* «Language» of the color at the Belorussian ritual and mythological text of the burial**

The article is devoted to the analysis of the semantics and functioning of color symbols at the Belorussian burial ritual and verbal texts, whichconnected with it. Historicaland paradigmatic studyof the «language» of the color made of thehistorical-genetic andfunctional-semantic methods as integrity phenomenon of the sign-symbolical system ritual and mythological text of the burial. White, black, red, yellow, green and dark blue colors are interpreted as important structural-semantic attributes of the ritual text. These colors are basic factor of mythological chromatic communication, which are directed at moving of physical death out of vital space and it guarding from harmful influence of the representative of Under-world.

Рукапіс паступіў у рэдкалегію 26.03.2012